ски, твердила про себя: «И буду, и буду, и всегда буду!» [1, с. 217]. Традиционно дискурсное пространство детства в рассказах Л. Е. Улицкой представлено в двух аспектах: во-первых, герои текстов – дети; во-вторых, герои текстов – взрослые, которые так или иначе поступают с детьми, реализуя в этих поступках свой менталитет и/или нравственный статус. Однако в некоторых текстах явственно проступает третий аспект: герои текстов – взрослые, в которых живет и проявляет себя ребенок. И чаще всего этот ребенок – несчастен и одинок.

Таким образом, к особенностям детского дискурса в рассказах Людмилы Улицкой относятся взаимоотстранение, сторонняя заинтересованность ребенка во взрослом мире, театрализация взрослого мира. Со стороны взрослых (в их отношении и приятии детей) определяются: жесткое подчинение принятым ментальным канонам, невидение перспективы их разрушения (отсутствие актуального знания), незаинтересованность в выборе.

### *ЛИТЕРАТУРА*


1. Улицкая, Л. Бедные, злые, любимые : Повести. Рассказы / Л. Улицкая. – М. : Изд-во Эксмо, 2006. – 384 с.


---


***Тумар Л. Р. (Мінск, Беларусь)***


## ХАРАКТАРЫСТЫКА МОЎНАЙ АСОБЫ ПРАЗ ВЫКАРЫСТАННЕ ОНІМАЎ У ЭПІСТАЛЯРНЫМ ТЭКСЦЕ (на матэрыяле лістоў Зоські Верас): ДА ПАСТАНОЎКІ ПЫТАННЯ


*Навук. кіраўн. – Н. П. Лобань, канд. філалаг. навук, дац.*


*Онім* (*імя ўласнае*) – слова, словазлучэнне або сказ, якія служаць для вылучэння названага ім аб'екта з шэрагу падобных. Уласныя імёны пранікаюць ва ўсе сферы чалавечай дзейнасці і даследуюцца ў розных аспектах. У цяперашні час існуе вялікая колькасць напрамкаў вывучэння онімаў пераважна ў мастацкім тэксце. Індывідуальна-аўтарскі кірунак з'яўляецца адным з іх і звязаны з выяўленнем асаблівасцей моўнага менталітэту аўтараў, а таксама іх гендарных адрозненняў. Уключэнне ў аўтарскі тэкст тых ці іншых разрадаў онімаў сведчыць аб іх каштоўнасці для пэўнага соцыуму і пэўнай асобы. Любая змена ў рэпертуары онімаў, якія ўводзяцца ў мастацкі, публіцыстычны або эпістальярны тэкст, паказальная, перш за ўсё, у дачыненні да антрапацэнтрычных адносін. Аўтар самастойна вырашае, з дапамогай якіх сродкаў ён данясе да чытача сваё светаадчуванне: эксперыментуючы з граматычнымі формамі, выкарыстоўваючы пэўныя пласты лексікі альбо ствараючы ўласныя наватворы. Асаблівую цікавасць выклікае праблема ўмоў функцыянавання ў тэксце ўласных імёнаў.

Аўтары манаграфіі «Тэорыя і методыка анамастычных даследаванняў», адзначаюць, што ў кожнага чалавека свой індывідуальны набор актыўна ўжывальных уласных імёнаў [2]. Гэты набор (або анамастыкон) вызначаецца кантынентам яго знаёмых, месцамі, дзе ён бываў, кнігамі, якія ён чытаў, спецыфікай яго адукацыі, скіраванасцю розуму і г.д. Як важны кампанент індывідуальнага стылю пісьменніка, які выказвае аўтарскія інтэнцыі, уласныя імёны ўводзяцца ў тэкст у выніку мэтанакіраванага адбору. Анамастыкон пісьменніка выступае, такім чынам, важнай складовай часткай яго індывідуальнай манеры адлюстравання рэчаіснасці. У сувязі з гэтым можна заключыць, што жыццёвы вопыт і іншыя фактары, якія з'яўляюцца знешнімі аспектамі творчай індывідуальнасці аўтара, знаходзяць адлюстраванне ў тэксце яго твораў, размалёўваючы яго аўтарызаваны слоўнік яркімі ўстаўкамі онімаў. Гэтыя онімы, якія выдзяляюцца ў якасці самастойнага лексічнага пласта такога роду слоўніка,



могуць служыць візітнай карткай аўтара, актуалізуючы праявы яго асобы (моўнай асобы) з пункта гледжання яе рэалізацыі ў мастацкім тэкстаскладанні. Не менш важным з'яўляецца і пытанне аб тым, як яны ўкараняюцца аўтарам у тэкст. Онімы, як правіла, злучаюцца з пэўнай фонавай інфармацыяй, якая неабходна для разумення такой тэкставай структуры, што, у сваю чаргу, вызначае новыя гарызонты вывучэння іх тэкстаўтваральных функцый.

Літаратурная анамастыка вывучае ўсе асаблівасці ўжывання ўласных імёнаў у тэксце мастацкага твора, у творчасці паэта, пісьменніка. Розныя падыходы да вывучэння функцыянавання онімаў ў мастацкім тэксце прадстаўлены ў шматлікіх айчынных і замежных публікацыях. У сферы ўвагі навукоўцаў аказваецца расстаноўка імёнаў у тэкставай прасторы, вынясенне ўласных імёнаў у загаловак, увядзенне онімаў у кантэкст твора, іх індывідуальна-аўтарскае ўжыванне. Немалай увагай карыстаюцца даследаванні ў галіне частотнасці ўжывання розных пластоў (катэгорый) прапрыяльнай лексікі.

Даследаванне анамастычнай прасторы эпісталярных тэкстаў Зоські Верас, на нашу думку, з'яўляецца важным, бо дазваляе прасачыць тую ролю, якую адыгрываюць онімы ў адлюстраванні індывідуальна-аўтарскай карціны свету, адносін аўтара да той ці іншай падзеі або чалавека.

Так, ступень напаўнення онімамі эпісталярных тэкстаў Зоські Верас розная [1]. Іх расстаноўка і частата ўжывання ў межах асобна ўзятага ліста неаднастайная і вар'іруецца. Да прыкладу можна прывесці выкарыстанне розных уласных найменняў, якія валодаюць адметным, нацыянальна-культурным кампанентам, сярод іх:

– беларускія геаграфічныя назвы: Сакольшчына, Ракуцёўшчына, Карпілаўка, Наваградчына, Ратамка, Ашмяна, Горадзень, Жупраны, Нёман, Лоша, Менск, Гудзевічы, Гродзеншчына, Куляўцы, Меншчына, Новы Двор, Кусцінцы, Гродна, Шутавічы, Круча, Слонім, Рудзенск, Бабруйск, Палессе, Случчына, Вялікая Бераставіца, Вільня і інш.),

– імёны і прозвішчы вядомых беларускіх дзеячаў і пісьменнікаў і інш.: М. Багдановіч, Ядвігін Ш., Цётка, З. Бядуля, В. Ластоўскі, Янка Крыўка, Ф. Грынкевіч, С. Новік-Пяюн, З. Абрамовіч, С. Шушкевіч, Ст. Станкевіч, Я. Маразовіч, У. Паўлюкоўскі, А. Клімовіч, П. Ластаўка, Адам Бычкоўскі, Будрык, Вера Леўчык, Канстант Шышэя, пане Мальдзіс, В. Швед, *П.* Каруза, Глеб Багдановіч, Арсень Сяргеевіч, Надзея Маркаўна, М. Явар, Аляксандр Мікалаевіч, Ігнат Буйніцкі, Я. Шутовіч, Лявон Заяц, М. Рылко, А. Паўловіч, Эдмунд, Стася, Максім, Родзька, Лёдзя, Тонюсь, Лявон, Слаўка, Валодзя, Бядуліха і інш.,

– назвы часопісаў, газет, таварыстваў: *«Шлях моладзі», «Студэнцкая думка», «Родная прырода», «Заранка», «Полымя», «ЛіМ», «Беларуская борць», «Крывіч», «Пралеска», «Маладосць», «Маланка», «Педагогическое дело», «Вольная Беларусь», «Дзянніца», «Przegl№d Wilecski», «Swietаж», «Наша ніва», «Вячэрні Мінск», альманах «Белавежа», «Общество пчеловодства», Беларускае кааператыўнае таварыства «Пчала», Пчалярскае таварыства, «Беларускае Таварыства ахвяр вайны», «Беларуская кнігарня», Гарадзенскі гурток беларускай моладзі, суполка «Загляне сонца і ў наша аконца»* і інш.

Такім чынам, пры даследаванні анамастычнай прасторы пэўнага эпісталярнага тэксту вызначаецца роля онімаў у адлюстраванні індывідуальна-аўтарскага бачання свету і адносін адрасанта да тых ці іншых з'яў рэчаіснасці. Акрамя таго, праз онімы (менавіта імёны і прозвішчы) можна вызначыць адносіны адрасанта да таго чалавека, пра якога вядзецца гаворка ў лісце. Анамастыкон Зоські Верас з'яўляецца важнай часткай, якая складае яе індывідуальную манеру адлюстравання рэчаіснасці. У сувязі з гэтым можна зрабіць выснову, што жыццёвы вопыт і іншыя фактары, якія з'яўляюц-




РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ца знешнімі аспектамі мастацкай індывідуальнасці аўтара, знаходзяць сваё адлюстраванне не толькі ў тэкстах мастацкай літаратуры, але і ў яго лістах.

### ЛІТАРАТУРА


1. Верас, З. Выбраныя творы / З. Верас ; уклад., прадм., камент. Г. Запартыка. – Мінск : Беларус. навука, 2015. – 572 с.
2. Теория и методика ономастических исследований / А. В. Суперанская [и др.]. – М. : Изд-во ЛКИ, 2007 – 256 с.


---


***Тычко Г. К. (Мінск, Беларусь)***


## ТВОРЧАСЦЬ МАКСІМА ТАНКА Ў КАНТЭКСЦЕ БЕЛАРУСКАЙ ПАЭЗІІ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ 50–80-Х ГАДОЎ XX СТАГОДДЗЯ

Пасля ўз’яднання Заходняй Беларусі з БССР у верасні 1939 года Максім Танк павінен быў шукаць новыя тэмы і матывы для сваёй творчасці. У даверaснёўскі перыяд у паэта выпрацавалася крытычнае стаўленне да тагачаснай беларускай савецкай літаратуры. «У ацэнцы літаратурных творцаў у нас існуюць дзве меры: адна – беларуская, другая – еўрапейская. Паводле першай – усе выдатныя, усе класікі. Паводле другой… Другой пакуль што няма каго і мераць», – іранічна пісаў ён у 1936 годзе ў сваім дзённіку [3, с. 244]. Зараз Танк сам стаў савецкім паэтам, з усімі палітычнымі, светапогляднымі і сацыяльнымі наступствамі, якія з гэтага вынікалі. Другая сусветная вайна, якая неўзабаве прыйшла на тэрыторыю Беларусі, дыктавала сваю тэматыку, патрабавала традыцыйнай для Танка патрыятычнай паэзіі змагання. Гэтыя матывы і ўвасобілася ў паэме «Янук Сяліба» (1943) і зборніках Танка часоў вайны з красамоўнымі назвамі «Вастрыце зброю» і «Праз вогненны небасхіл» (1945).

Станоўчыя змены ў грамадска-палітычным жыцці другой паловы 1950-х гадоў, якія наступілі пасля XX з’езду КПСС і выкрыцця культу асобы, невыпадкова называюць часам адлігі. Нясмелы подых вясны адчувае ўся тагачасная творчая інтэлігенцыя, у тым ліку і Максім Танк, які акурат у гэты перыяд (з 1948 па 1966 год) становіцца галоўным рэдактарам «Полымя» – самага аўтарытэтнага тагачаснага літаратурнага часопіса Беларусі. Менавіта на старонках гэтага выдання і распачынаецца духоўна-творчае абнаўленне беларускай паэзіі. Тэндэнцыя крытычнага пераасэнсавання рэчаіснасці, канцэптуальнага перагляду ранейшых светапоглядных установак у тым ліку і на ўласную творчасць набірае моц, таму паэзія грамадзянскага гучання вызначае змест і скіраванасць беларускага літаратурнага працэсу. Узнікае нават новы жанравы тып вершаў, у якіх арганічна спалучаюцца выкрывальна-сатырычныя ноты і страсны ўнутраны маналог непрыняцця скажонай, хлуслівай рэчаіснасці. Гэта як славутыя непрымірыма з’едлівыя «Прыстасаванцы», «Трэснула-грукнула…» П. Панчанкі, так і вершы самога Максіма Танка: «Дачнікі», «З хронікі», «Заява ў гарсавет» і інш.

І трэба ж было гэтак здарыцца: летам / У парк заблудзіў загадкульт гарсавета <…> / Убачыў сваім мнагавопытным вокам, / Што справы культуры стаяць невысока. / Нідзе не прыбіты да дрэваў таблічкі, / Ці гэта – садовая груша, ці дзічка, / Ці гэта – бяроза, ці хвоя бароў, / І колькі на дрэве сукоў і лістоў. / Заўважыў яшчэ, што няма ўказанняў / Як трэба прагульвацца тут грамадзянам, / Дзе можна прысесці, а дзе пахадзіць, / Дзе можна смяяцца, а дзе –гаварыць» [2, с. 31].

Па-сутнасці, гэты тэкст – з’едлівае выкрыццё ўсё той жа таталітарнай сістэмы, з яе заўсёднай скіраванасцю на строгую рэгламентацыю і бюракратызм, але танальнасць верша дабрадушна-спакойная. Твор выяўляе адну з характэрных рыс Максіма Танка як паэта і як чалавека: яго заўсёднае пачуццё гумару і ўраўнаважаную немітуслівасць, характэрную для беларускага менталітэту.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ